**Зімніцкі А. А.**

# ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ДАСЛЕДАВАННЯ ЗБОРУ ЗАСЦЕРАГАЛЬНАГА ЎЗБРАЕННЯ XVI–XVII СТСТ. У КАЛЕКЦЫІ «ВАЙСКОВАЕ АБМУНДЗІРАВАННЕ І РЫШТУНАК» НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІСТАРЫЧНАГА МУЗЕЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

***Ключавыя словы:*** засцерагальнае ўзбраенне, XVI–XVII стст., Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, калекцыя «Вайсковае абмундзіраванне і рыштунак», зброя.

Фонды Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь (далей – НГМ РБ) на дадзеным этапе налічваюць каля 350 адзінак агнястрэльнай зброі і яе частак, больш за 1600 боепрыпасаў і каля 500 узораў халоднай зброі. Істотнае месца сярод больш чым 1600 артэфактаў калекцыі “Вайсковае абмундзіраванне і рыштунак” займае таксама і збор засцерагальнага ўзбраення. Пад апошнім маецца на ўвазе савакупнасць матэрыяльных сродкаў, прызначаных для абароны ваяра ад паражэння зброяй праціўніка [5, с. 75; 10, с. 73]: баявыя нагалоўі (шлемы), прыкрыцці тулава і канечнасцей (даспехі), шчыты і элементы конскага даспеху як дадатковыя часткі абароны кавалерыста. Храналогія збору абмяжоўваецца XVI–XVII стст., бо на дадзеным этапе ў гэтай калекцыі не выяўлена элементаў засцерагальнага ўзбраення ранейшых за XVI ст. Варта адзначыць, што такія элементы захоўваюцца ў археалагічнай калекцыі музея, куды яны трапілі бо маюць археалагічнае паходжанне, аднак іх даследаванне вартае асобнага артыкулу. XVII ст. як верхняя храналагічная мяжа збору абумоўлена больш гістарычнымі фактарамі, ключавы з якіх – завяршэнне “эпохі даспехаў”. Менавіта ў гэты перыяд назіраецца паступовая мінімізацыя засцерагальнага ўзбраення на целе жаўнера, поўны, ці частковы даспех перастае быць неад’емным атрыбутам ваяра як баявой адзінкі і паступова выходзіць з ужытку [4, с. 156–162 ].

У межах агульнага агляду гісторыі збору, можна адзначыць што, першыя элементы даспехаў былі перададзеныя у фонды музея ў красавіку 1957 г., літаральна праз некалькі месяцаў пасля стварэння арганізацыйнай групы для правядзення падрыхтоўчых работ па адкрыцці Беларускага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея (фактычнага аднаўлення дзейнасці музея ў пасляваенны перыяд) [7, с. 13]. Цягам 1957–1963 гг. быў сфармаваны асноўны прадметны масіў збору – 103 адзінкі захоўвання. Асноўнай формай паступлення з’яўляліся перадачы з іншых музеяў – 98 адзінак з 1957 па 2019 гг. За той жа перыяд найбольшую колькасць прадметаў перадаў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (далей –

БДМГВАВ) – 64 адзінкі. Найбольш значныя яго перадачы: 1957 г. – 26 адзінак і 1962 г. – 30 адзінак; кальчуга КП 2359 прыйшла з БДМГВАВ праз Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава; апошняя перадача – фрагмент ад шлема КП 56595 у 2019 г. Першынство БДМГВАВ сярод асноўных фундатараў збору засцерагальнага і іншых відаў узбраення і рыштунку было абумоўленае тым, што ў першыя пасляваенныя гады толькі БДМГВАВ меў магчымасці для захавання экспанатаў для будучага гістарычнага музея, у т.л. і прадметаў з даваенных калекцый Беларускага дзяржаўнага музея (далей – БДМ) [12, с. 63–64 ]. Сярод іншых буйных здатчыкаў таксама варта адзначыць Дзяржаўны Эрмітаж і Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей.

Ключавымі ўзаемазвязанымі праблемамі, якія паўстаюць перад даследчыкамі збору, з'яўляюцца: вызначэнне яго межаў і ўдакладненне колькасці артэфаткаў.

Першая праблема вынікае з няпэўнай атрыбуцыі прадметаў, якая пазначана ў дакументацыі музея. Наш адбор праводзіўся на аснове ключавых дакументаў музейнага ўліку – Кніг паступленняў прадметаў НГМ РБ, аднак часта атрыбуцыя артэфактаў нават ў гэтых кнігах выглядае досыць размыта, як напрыклад: нумар КП 6099 "Даспехі рыцарскія. 30 адзінак." (тут і далей – перакладзена з рускай на беларускую мову аўтарам). Прычынамі такой абагульненасці і адсутнасці індывідуальнай атрыбуцыі кожнага прадмета маглі быць: хуткасць фармавання фондаў музея і немагчымасць даследавання кожнага прадмета асобна, адсутнасць адпаведных спецыялістаў ці сродкаў для атрыбуцыі і шмат іншых. Таксама добрай ілюстрацыяй узроўню даследаванасці з'яўляецца той факт, што вялікая колькасць элементаў даспехаў пры фармаванні калекцыі была аднесеная да навукова-дапаможнага фонду, хаця самі прадметы не маюць ніякіх прыкмет неарыгінальнасці.

На дадзеным этапе колькасць цэлых элементаў, а таксама асобных частак засцерагальнага ўзбраення можна акрэсліць ў больш чым 100 адзінак захоўвання. Сярод ключавых прычын, якія перашкаджаюць вызначэнню рэальнай колькасці гэтых артэфактаў, можна назваць праблему суаднясення саміх прадметаў з іх дакументальным адлюстраваннем у Кнігах паступлення нашага музея, а таксама ў дакументацыі папярэдніх устаноў-захавальнікаў. З моманту ўтварэння збору адзначаліся адзінкавыя спробы ўдакладнення колькасці некаторых (у асноўным парных) артэфактаў і наданне ім дробавай нумарацыі, аднак да гэтага часу фактычна "не разабранымі" застаюцца такія масівы артэфактаў як НД 2497 "Розныя дэталі рыцарскіх даспехаў" (афіцыйная колькасць – 21 прадмет); КП 5258 "Латы рыцарскія. Заходняя Еўропа (для рук, ног, шыі і інш.)" (афіцыйная колькасць – 19 прадметаў), КП 6099 "Даспехі рыцарскія" (афіцыйная колькасць –

30 прадметаў). Іх рэальная колькасць, па меркаванні аўтара і яго папярэднікаў на пасадзе захавальніка калекцыі, складае: каля 26, каля 80 і каля 36 адзінак захоўвання адпаведна. Фактычна з моманту свайго паступлення ў 1957–1962 гг., гэтыя даспехі так і не былі ўпарадкаваныя і вывучаныя, т.б. яны захоўваліся ўмоўным комплексам пад адным нумарам, без атрыбутацыі і прысваення асобнага дробавага нумару кожнаму з прадметаў. За амаль шэсцьдзесят год захоўвання, пасля ўсіх пераездаў фондаў музея, сцёрліся нават тыя нумары, якія былі на прадметах, а біркі з імі пагубляліся. Да таго ж, шэраг элементаў захоўваецца ў разабраным стане, хаця, верагодна, паступалі яны як цэльныя прадметы.

Росшук і суаднясенне рэальных прадметаў з іх дакументальным адлюстраваннем у кнізе паступленняў маглі б быць аблегчаныя за кошт прыцягнення атрыбуцый і памераў прадметаў, пазначаных у актах выдачы-прыёма і дакументацыі папярэдніх устаноў-захавальнікаў. Аднак і тут не ўсё так проста. Добра ілюструе гэту сітуацыю прыклад з прадметам НД 2494"Даспехі рыцарскія – нагрудніка частка", які перадаваўся разам з "праблемным" нумарам НД 2497. З акта № 560 ад 03.04 1957 г. можна даведацца нумар, пад якім гэтая частка нагрудніка захоўвалася ў БДМГВАВ – 2268. Гэты ж нумар захаваўся на самім прадмеце, што папярэдне дазваляе быць упэўненым у тым, што гэта менавіта той прадмет, які перадаваўся згодна дакументам. У сваю чаргу, пад гэтым нумарам у "Кнізе паступленняў №2 (БДГМ)"[1] мы знаходзім запіс: "Даспехі рыцарскія – нагрудніка частка. № па вопісу 3964. Жалеза. 45 см. Іржавае. 20 рублёў." У "Акце і вопісе музейных экспанатаў, вернутых ў СССР з Германіі" [1], да якога адсылае кніга паступленняў і нумар 3964, пазначана: "Нагруднік жалезны, БДМ. Жалеза. Даўж.35 см Пашкоджаны. 20 рублёў." Ужо на этапе супастаўлення двух гэтых запісаў відавочныя супярэчнасці як у атрыбуцыі, так і ў памерах прадмета. Больш яўнымі яны становяцца пасля даследавання самога артэфакта, які фактычна з'яўляецца не часткай нагрудніка, а задняй часткай абойчыка – металічнага каўнера ў выглядзе адной, альбо некалькіх рухомых злучаных пласцін, якія абаранялі горла і верхнюю частку грудзей [9, с. 264]. У той жа час, гэта ведаем мы, маючы пэўны вопыт і стос літаратуры, чаго, магчыма, не меў той музейшчык, які вызначаў атрыбуцыю гэтага прадмета ў сярэдзіне ХХ ст. Даваў ён яе, верагодна, уявіўшы да якой часткі цела гэты элемент мог падыходзіць ці анатамічна падобны, і ў шырокім сэнсе, звязаўшы яго з

---

[1]Асобныя кнігі паступленняў якія вяліся супрацоўнікамі БДМГВАВ для прадметаў, што павінны былі паступіць у фонды будучага Беларускага дзяржаўнага гістарычнага музея (БДГМ). Зараз гэтыя кнігі захоўваюцца ў архіве БДМГВАВ.

грудзьмі, ён усё ж меў рацыю. Аднак агулам, дадзены выпадак змушае больш асцярожна адносіцца да атрыбуцый прадметаў пазначаных ва ўліковай дакументацыі музеяў. Падобным жа чынам выглядае сітуацыя і з памерамі прадмета. Калі ў вопісе 1948 г. хаця б пазначана, што 35 см. – гэта даўжыня, то ў кнізе паступленняў невядома, які замер (даўжыня, шырыня, дыяганаль?) раўняўся 45 см., ці, магчыма, гэта ўвогуле была апіска ў лічбах 3/4. Рэальная ж даўжыня прадмета па ніжнім краі 32,3 см. Таксама варта ўлічваць, што ў іншых прадметах на дадзены момант можа не хапаць нейкіх частак, якія прысутнічалі на момант замераў.

Такім чынам, нават маючы поўны стос уліковай дакументацыі музеяў адносна пэўнага масіву артэфактаў, дзе пазначаная атрыбуцыя, іх памеры і іншыя прыкметы, гэта не гарантуе нам лёгкага вызначэння ўліковага нумару таго ці іншага прадмета.

Падагульняючы, можна адзначыць, што пры вырашэнні першасных, "унутрымузейных" праблем даследавання засцерагальнага ўзбраення ў фондах НГМ РБ варта ўлічваць наступныя нюансы:

- атрыбуцыя і колькасць прадметаў, пазначаная ва ўліковай дакументацыі музея, патрабуе ўдакладнення (асабліва гэта датычыць масіваў НД 2497, КП 5258, КП 6099), але ў працэсе гэтага ўдакладнення варта памятаць, што паасобныя прадметы зараз, маглі быць адным прадметам на момант паступлення;
- пры супастаўленні прадметаў з іх адлюстраваннем у дакументацыі варта асаблівую ўвагу надаваць росшуку на прадмеце захаваўшыхся ўліковых нумароў;
- пры вызначэнні рэальнай атрыбуцыі артэфакта, яго памераў і асаблівых прыкмет варта ўлічваць, як гэта ўсё магло інтэрпрэтавацца папярэднімі музейшчыкамі і адпаведна адлюстроўвацца ў дакументацыі.

У той жа час, ужо на дадзеным этапе даследавання збору можна акрэсліць і некаторыя перспектыўныя накірункі для далейшай працы. Акрамя вырашэння вышэйазначаных "унутрымузейных" праблем, звязаных з удакладненнем атрыбуцыі і колькасці прадметаў, да гэтага часу застаецца недапісаным і іх правенанс. Напрыклад, згаданы вышэй "Акт і вопіс музейных экспанатаў, вернутых ў СССР з Германіі" адсылае нас да даваеннага захавальніка многіх даспехаў – БДМ. Апошні, працуючы ў 20–30-х гг. пад рознымі назвамі [2, 3, 8], фактычна заклаў аснову фондаў будучага НГМ РБ [6, с. 63; 7 с. 14]. У сваю чаргу, вывучэнне спадчыны БДМ падводзіць нас да перспектыў зброязнаўчага даследавання асобных экзэмпляраў і цэлых калекцый узбраення, якія верагодна вядуць сваё паходжанне з тэрыторыі Беларусі [11, с. 119]. Адным з прыватных пацверджанняў гэтай тэзы з'яўляецца вы-

яўленне ў калекцыі НГМ РБ (у масіве трох вышэйазначаных “праблемных” нумароў) элементаў даспехаў, якія верагодна паходзяць са збораў зброі і даспехаў Нясвіжскага палаца Радзівілаў, што пацвярджаецца адпаведнымі пломбамі на прадметах. Сярод ахоўнага ўзбраення ў зборах НГМ РБ таксама можна вылучыць і шэраг тэматычных комплексаў, кшталту: даспехі XVI ст. для кавалерыста і каня, гусарскія даспехі XVI–XVIII стст., альбо даспехаў наватвораў XIX ст., якія з’яўляюцца элементам тагачаснай моды на арыенталізм. У перспектывах экспазіцыйнай дзейнасці яны могуць заняць (а гусарскія даспехі ўжо займаюць) сваё належнае месца ў залах музея, раскрываючы тыя ці іншыя аспекты мілітарнай культуры.


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 790. Воп. 1. Спр. 69.
2. Бамбешка, І. І. Камплектаванне фондаў Беларускага дзяржаўнага музея ў 1920-я гг. / І. І. Бамбешка // Музейны веснік / Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі. – Мінск, 2005. – Вып. 2. – С. 10–17.
3. Бамбешка, І. І. Мінскі абласны музей. Гісторыя стварэння і дзейнасці (20.01.1919 – 31.08.1923) / І. І. Бамбешка // Музейны веснік / Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі. – Мінск, 2003. – Вып. 1. – С. 5–10.;
4. Блэр, К. Рыцарские доспехи Европы. Универсальный обзор музейных коллекций / К. Блэр ; пер.с англ. Е. В. Ламановой. – М. : ЗАО Центрполиграф, 2008. – 256 с.
5. Бохан, Ю. М. Узбраенне насельніцтва беларускіх зямель у XIV–XVI стагоддзях / Ю. М. Бохан. – Мн. : Беларусь, 2012. – 151 с.
6. Гужалоўскі, А. А. Музеі Беларусі (1941–1991 гг.) / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2004. – 192 с.
7. Калымага, Н. Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі: камплектаванне музейнага збору ў 1957–1967 гг. / Н. Калымага, А. Ладзісаў // Музейны веснік / Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі. – Мінск, 2008. – Вып. 4. – С. 13–17.
8. Ксяневіч, Ю. Структура Беларускага дзяржаўнага музея ў 20–30-я гг. XX ст. / Ю. Ксяневіч // Музейны веснік / Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі. – Мінск. – 2005. – Вып. 2. – С. 5–10.;
9. Нясвіж. Палацава-паркавы ансамбль. Збор зброі і даспехаў. Кніга-альбом. / тэкст С. Егарэйчанка, фотаздымкі, мастацкае афармленне А. Аляксееў, А. Лукашэвіч, уступны артыкул А. Паўлоўскі – Мінск : А. Аляксеў, 2017. – 272 с.
10. Плавінскі, М. А. Узбраенне беларускіх земляў X–XIII стагоддзяў / М. А. Плавінскі. – Мн. : Галіяфы, 2013. – 106 с.
11. Стрельченко, А. Позднесредневековый меч из собрания Национального исторического музея Республики Беларусь / А. Стрельченко, Д. Шляхтин // Acta archaeologica Albaruthenica: навуковае выданне / укладальнікі: М. А. Плавінскі, В. М. Сідаровіч. – 2010. – Vol. 6. – С. 119–122.
12. Шляхцін, Дз. З гісторыі фарміравання ваенна-гістарычных калекцый Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі ў канцы 1950-х – першай палове 1960-х гг. / Дз. Шляхцін // Музейны веснік / Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі. – Мінск, 2008. – Вып. 4. – С. 63–66.